# ДАРАГІЯ СПЯВАЧКІ



ЗАКУЛІССЕ ШОУ-БІЗНЕСУ

СТАР. 4-5

ТУТ І ЦЯПЕР

# ПАРАЛЕЛІ

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ НОВАЙ РУБРЫКІ



СТАР. 5,7

**БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **5.08-11.08.2009 г.**

# ПАСТАНОВА-ТРОХДЗЁНКА ЯК ЗАВЯДЗЁНКА

## Ці надоўга прадпрымальніцкая супольнасць адстаяла сваё права на існаванне

### У ПАМЯЦІ НАЗАЎСЁДЫ

Напэўна, пастанова Савета Міністраў № 991 атрымалася самай рэзананснай за апошнія 15 гадоў, і яе нумар назаўсёды запомняць усе тыя, хто мае хаця б нейкае дачыненне да імпарту тавараў.

У адпаведнасці з пастановай № 991 “Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь” юрыдычныя асобы павінны былі набываць тавары (за кошт уласных, пазыковых сродкаў і сродкаў бюджэту) у пастаўшчыкоў, якія з’яўляюцца вытворцамі, альбо іх афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў. Пры гэтым улады павінны былі сфарміраваць пералікі афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў, у якіх юрасобы змаглі б закупляць тавары.

Калі пераводзіць усё гэта на даступную мову, то пастанова № 991 ставіла па-за законам УСІХ пасярэднікаў, якія займаліся імпартам. Дый не толькі іх. Дзяржава такім немудрагелістым спосабам хацела захаваць крышачку валюты ў краіне, абсалютна не падумаўшы пра наступствы. “Кажучы аб мэце прыняцця названай пастановы ўрада, перш за ўсё я хацеў бы адзначыць, што яе трэба разглядаць як антыкрызісную меру”, – заявіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Аднак незалежныя эксперты ў адзін голас ахарактарызавалі гэтую пастанову як абсалютна недарэчную. Вядомы эканаміст Леанід Заіка ўвогуле асабліва не шукаў слоў для характарыстыкі “антыкрызіснай меры”: “Сама гэтая пастанова патрабуе псіхіятра, таму што сядзелі са студзеня, пакуль таварныя запасы раслі літаральна на вачах. А цяпер прымаюць такую пастанову на фоне таго, што ў Заходняй Еўропе ўвогуле ўсе склады ачысціліі... Гэта позна і няўмела”.




*Няўжо прыйдзецца купляць імпартнае толькі ў крамах для канфіската?*

### ТЭАТР АБСУРДУ

Сітуацыя сапраўды магла дайсці да поўнага абсурду: дзесяткі тысяч прадпрымальнікаў не толькі атрымалі б статус беспрацоўных, але і адбылося б татальнае вымыванне імпартных тавараў з паліц беларускіх магазінаў. Прадпрымальніцкая супольнасць дружнымі шэрагамі выступіла супраць такіх падыходаў да аптымізацыі айчыннай эканомікі, і ў выніку сумна вядомая пастанова пратрымалася 3 (!!!) дні. 1 жніўня яна ўступіла ў сілу, а ўжо 4 жніўня па загадзе Аляксандра Лукашэнкі, які вярнуўся з Кіргізіі, была адменена ўрадам. Прычым што цікава, Савет Міністраў адмяніў сваю ж пастанову, можна сказаць, заднім чыслом (!). Яго пастанова, якая адмяняе пастанову № 991, датуецца 4 жніўня, але пачынае дзейнічаць з… 2 жніўня гэтага года.

Бізнес сапраўды выступіў у абарону сваіх правоў шчыльнымі шэрагамі. Нават асобнае недзяржаўнае прадпрыемства “Кітайскія аўтамабілі” рашылася на рэзкую крытыку ўрада. Вось што гаварылася ў прэсавым рэлізе гэтай кампаніі: “Пастанова Саўміна прывядзе да дэградацыі таварнага рынку і росту беспрацоўя”. Прыблізна такіх жа ацэнак прытрымліваліся і найбольш уплывовыя прадпрымальніцкія структуры. І… перамаглі!

*Заканчэнне на стар. 3*

**СЕНСАЦЫЯ**

Інтэрнэт-выданне “Штодзённік” паведаміла пра тое, што ў КДБ Магілёўскай вобласці завялі справу, у якой фігуруе начальнік мясцовай управы Дэпартамента выканання пакаранняў палкоўнік Вячаслаў Сядоў.

## ПАПАРЫЎСЯ…

Справа заведзена паводле артыкула аб злоўжыванні службовым становішчам. Правяраюцца звесткі, згодна з якімі падначаленыя нібыта рамантавалі лазню і парадкавалі зямельны ўчастак палкоўніка ў Бялыніцкім раёне.

Каб праверыць інфармацыю пра тое, што дзейнасцю палкоўніка Сядова займаецца КДБ, я патэлефанаваў у магілёўскую ўправу Дэпартамента выканання пакаранняў. Злучыцца наўпрост з Вячаславам Сядовым не ўдалося. “Ён у адпачынку з 27 ліпеня, — сказала падначаленая Сядова. — Яго замяняе Чмаракоў Пётр Міхайлавіч”.

Спадар Чмаракоў слухаўку таксама не падняў.

У магілёўскім КДБ інфармацыю пра справу турэмнага начальніка не каментуюць.

Да прызначэння два гады таму на пасаду начальніка абласной управы Вячаслаў Сядоў быў начальнікам 19-й магілёўскай калоніі, раней працаваў на розных пасадах у беларускіх турмах.

**АЛЕГ ГРУЗДЗІЛОВІЧ**



# ЦІ САПРАЎДЫ БЕЛАРУСЫ ДАВЯРАЮЦЬ ЦАРКВЕ, ВОЙСКУ І МІЛІЦЫІ?

**Сацыялагічны цэнтр “Люстэрка-інфо” даведаўся ў нашых грамадзян, у якой ступені яны давяраюць людзям, што прадстаўляюць тыя або іншыя арганізацыі і структуры.**

**Традыцыйна лідзіруе ў рэйтынгу даверу грамадства царква – ёй часткова або поўнасцю давяраюць 73 % беларусаў. Далей ідуць армія – 69 %, суды і міліцыя – па 60 %, дзяржаўныя СМІ – 59 %, недзяржаўныя – 57 %, урад – 55 % (пазіцыі “прэзідэнт” асобна няма), мясцовыя органы ўлады – 51 %, ААН – 44 %, Нацыянальны сход – 42 %, апазіцыя – 40 %, АБСЕ – 39 %, традыцыйныя прафсаюзы – 35 %.**




*Людскі выбар – справа складаная*

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “НЕ МОГУЦЬ 60 % ЛЮДЗЕЙ ДАВЯРАЦЬ МІЛІЦЫІ І СУДУ”

- Я канцэптуальна не давяраю ўсім сацыялагічным апытанням. Па-першае, “Люстэрка-інфо” – служба, сфармаваная ўладамі, якая ўвесь час нават не хлусіць, а наўпрост працуе на ўладу. А па-другое, нават калі ў нейкіх пытаннях яна не хлусіць, то я раблю выснову, што метадалогія неадэкватная, сырая, а гэта не дазваляе высветліць праблему. Каб 60 % беларусаў верылі судам і міліцыі! Хоць забіце мяне, гэта хлусня. Адной такой пазіцыі дастаткова, каб паставіць пад сумнеў усё астатняе. Затым увесь час у нас лідзіруе царква. Фармальна, лічу, так і ёсць. Але па сутнасці гэта абсалютна не адлюстроўвае месца царквы ў свядомасці людзей, у іх духоўным і сацыяльным жыцці. Што да месца апазіцыі, то, на маю думку, тут усё адэкватна. Сапраўды, у апазіцыі рэйтынг вельмі нізкі ўжо шмат гадоў.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, АНАЛІТЫК:**

## “ДАНЫЯ “ЛЮСТЭРКА” НЕ ХЛУСЯЦЬ”

– Я думаю, што калі і адрозніваюцца даныя “Люстэрка” ад рэальных паказчыкаў, то не нашмат. Высокі рэйтынг даверу да царквы і войска тлумачыцца тым, што звычайна гэтыя інстытуты не тычацца большасці людзей у паўсядзённым жыцці – ёсць і ёсць. Што да астатніх, то я, шчыра кажучы, сам сумняваюся ў такіх паказчыках і размаўляў з рознымі сацыёлагамі, якія маюць дачыненне да правядзення апытанняў. І яны тлумачаць тое, што паказчыкі праафіцыйных сацыялагічных каманд адрозніваюцца ад незалежных, формай зададзеных пытанняў і спосабам прадстаўлення інтэрв’юераў (тых, хто праводзіць апытанне). Яны задаюць пэўны кантэкст, на які рэагуюць тыя, хто адказвае. Да таго ж калі інтэрв’юер прадстаўляецца як незалежны, то да яго ставяцца інакш, чым да дзяржаўнай асобы. Не думаю, што трэба абвінавачваць у падтасоўцы пэўных фактаў. Калі б яна была ў сацыялагічных даных, то хутка такія каманды страцілі б рэпутацыю.

**ВАЛЯНЦІНА КАРПОВІЧ, НАСТАЎНІЦА:**

## “БЕЛАРУСАМ ХОЧАЦЦА ВЕРЫЦЬ У БОГА”

– У гэтым апытанні няма ніякай хлусні. Царкву беларусы ставяць на першае месца таму, што, шчыра кажучы, яны не надта давяраюць зямной уладзе. Калі б у апытанні была пазіцыя “Бог”, то яна заняла б першае месца. Гэта не сведчыць пра вялікую рэлігійнасць беларусаў. Гэта кажа, што верыць асабліва няма каму. Войска ў краіне, якая да гэтае пары залізвае раны апошняй вайны, будзе заўжды ў пашане. А міліцыі і ўсім астатнім аддаюць давер у выглядзе добрага пажадання.

**АЛЕГ МАНАЕЎ, САЦЫЁЛАГ, ЗАСНАВАЛЬНІК НІСЭПД:**

## “БЕЛАРУСЫ НЕ ЗМЯНІЛІСЯ АД ЧАСОЎ МІКАЛАЯ І”

– Вынікі нашага чэрвеньскага апытання даўно вісяць на сайце. Структура вельмі блізкая да гэтых даных. Першую пазіцыю царква трымае з вясны 1991 года. Пасля ідзе войска. Часам прэзідэнт выскоквае на трэцяе месца, часам апускаецца. Апошнія некалькі гадоў ён трымае трэцяе-чацвёртае месца. І характэрна, што супрацоўнікі “Люстэрка” напісалі ў сваіх апытальных лістах “урад”. А раптам “прэзідэнт” будзе ніжэй, чым ім хочацца?! Як бы там ні было, атрымліваецца старая расійская парадыгма інстытуцыянальных асноў, сфармуляваная графам Уваравым у 30-я гады XIX стагоддзя: “Бог, цар і вайсковы начальнік”. Ад часоў Мікалая І не шмат змянілася… Гэта лішні раз падкрэслівае, што калі мы гаворым пра беларусаў як пра масу, а не як пра кола нашых знаёмых, дык для масы гэтая парадыгма больш блізкая, чым успаміны пра Вялікае княства Літоўскае ці БНР. А што тычыцца першага месца апазіцыі ў адмоўным рэйтынгу, то, на маю думку, яна не з’яўляецца сур’ёзным фактарам ні палітычных працэсаў у Беларусі, ні нават сацыяльных.

**АЛЕСЬ ЛІПАЙ, КІРАЎНІК ІНФАРМАЦЫЙНАГА АГЕНЦТВА “БЕЛАПАН”:**

## “ЯКАЯ САЦЫЯЛОГІЯ Ў АТМАСФЕРЫ СТРАХУ?”

– Магчыма, такі высокі рэйтынг у царквы і войска тлумачыцца кансерватыўнасцю грамадства. Што тычыцца апазіцыі, то яна магла аказацца ў гэтым апытанні на першым месцы ў адмоўным рэйтынгу толькі з-за таго, што занадта кароткі быў спіс інстытутаў.

Аднак ці ёсць там звесткі пра тое, колькі людзей давяраюць самім сацыялагічным цэнтрам? У прыватнасці, “Люстэрку”? Гэтага вельмі не хапае. Я лічу, што ў беларускім грамадстве, частка якога баіцца гаварыць тое, што думае, давяраць сацыялагічным даследаванням можна з вялікай нацяжкай. А некаторым дык увогуле нельга.

**ДАРЭЧЫ**



**Макс ВЕБЕР, вучоны:**

**“Сацыялогія, таксама як і гісторыя, дае спачатку “прагматычнае” вытлумачэнне, грунтуючыся на рацыянальна зразумелых сувязях дзеянняў. Бо яе спецыфічным аб’ектам мы лічым не любы від “унутранага стану” або знешняга стаўлення, а дзеянне”.**

# ПАСТАНОВА-ТРОХДЗЁНКА ЯК ЗАВЯДЗЁНКА

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Аляксандр Лукашэнка, які ў гэтай сітуацыі выглядае як “добры пан”, што прыехаў і па справядлівасці разабраўся, даручыў ураду “прыняць меры па выпраўленні негатыўнай сітуацыі, якая склалася”. Быццам бы такія пастановы могуць прымацца без яго ведама…

Праўда, і пасля вяртання статусу-кво для шматлікіх прадпрымальнікаў прагучала адно маленькае, а можа, і не зусім маленькае “але”: маўляў, усё роўна трэба аптымізаваць паслугі пасярэднікаў, якія не вельмі прыстойна паводзяць сябе падчас сур’ёзнага эканамічнага крызісу і працягваюць накручваць свае шалёныя прыбытковыя працэнты.

Ці так гэта на самай справе?

## УСЁ ВЕЛЬМІ БАНАЛЬНА

З **нашым выданнем** на гэтую тэму згадзіўся пагутарыць **намеснік дырэктара адной фірмы**, якая пастаўляе ў Беларусь расійскія ўшчыльнікавыя матэрыялы: “Сітуацыя вельмі простая. Мы, як пасярэднікі, можам згінуць натуральным шляхам. Няхай дзяржаўныя прадпрыемствы напрамую працуюць з замежнымі партнёрамі. Што і хто ім у гэтым перашкаджае? А я вам скажу што і хто.

Па-першае, расійскім партнёрам больш цікава працаваць з намі, таму што мы можам браць буйныя аптовыя партыі таго ці іншага тавару. Пры гэтым атрымліваем і 15–20-працэнтныя зніжкі. Адно асобна ўзятае прадпрыемства гэтых зніжак, зразумела, не атрымае. Дый ці захоча, напрыклад, Мінская ЦЭЦ займацца закупкамі імпартных камплектуючых? Для гэтага трэба ствараць аддзел па знешнеэканамічных сувязях, займацца пераводам адной валюты ў другую, распрацоўваць схему адносін з мытняй і г.д.

**Згодна інфармацыі старшыні сталічнага Саюза прадпрымальнікаў Уладзіміра Карагіна, з-за трохдзённага дзеяння пастановы № 991 гандлёвы абарот краіны недаатрымаў 150-200 мільёнаў долараў.**

Па-другое, і асобныя дзяржаўныя фірмы, і цэлыя канцэрны (напрыклад, “Белнафтахім”) не вельмі паваротлівыя і гібкія пра арганізацыі паставак у краіну імпартных камплектуючых. Каб вы паверылі ў справядлівасць маіх слоў, адзначу толькі адзін нюанс. Заяўкі на набыццё такіх камплектуючых падобнымі канцэрнамі фарміруюцца ажно на год наперад. Пра якую рынкавую канкурэнтаздольнасць і лібералізацыю пры такім раскладзе можа ісці гаворка?”

### КАМПЕТЭНТНА



У інтэрв’ю “Тут і цяпер” былы міністр працы краіны **Аляксандр Сасноў** распавёў, што падобная практыка прыняцця звышважных рашэнняў для ўсёй краіны існуе ўжо даўно: “У сувязі з гэтым магу нагадаць хаця б толькі прэзідэнцкі ўказ аб адмене льгот у 1995 годзе, які праіснаваў таксама нядоўга. Гэта тычыцца і іншых знакавых пастаноў і ўказаў, якія прымаліся, прама скажам, некваліфікавана. Чаму гэта адбываецца? Адказ відавочны. Падобныя рашэнні рыхтуюцца ў вельмі вузкім коле без удзелу тых, каго яны непасрэдна тычацца. Вельмі добра, што бізнес-саюзы цяпер адстаялі свае права на існаванне. Але дзе гарантыя, што нешта падобнае да пастановы № 991 не з’явіцца заўтра?”

## КАЛІ КІРУЮЦЬ “НАРГАСАЎСКІЯ ТРОЕЧНІКІ”

Дарэчы, па іроніі лёсу яшчэ да нядаўняга часу ўрад так доўга і так красамоўна гаварыў пра гэтую самую лібералізацыю, асабліва ў недзяржаўным сектары. Пастанова № 991 за 3 дні паказала, як у нас збіраюцца лібералізаваць эканоміку.

Аляксандр Сасноў упэўнены, што ў краіне па-ранейшаму дзейнічаюць згодна з вядомымі камуністычнымі пастулатамі: “Навошта нешта ствараць дадатковае і незразумелае, што да таго ж праз нейкі час можа выйсці з-пад кантролю, калі можна прывычна адняць і падзяліць?”

Леанід Заіка яшчэ больш жорсткі ў ацэнцы апошніх дзеянняў урада: “Калі ва ўрадзе “наргасаўскія троечнікі”, цяжка што-небудзь зрабіць…”

Гэтым “троечнікам” далі жорсткае ўказанне вызваліць склады ад тавараў, якія там назбіраліся, і яны будуць вылазіць са скуры, а гэтае ўказанне выконваць. Прычым звыклымі адміністрацыйнымі метадамі.

А гэта значыць, што клон жудаснай па сваёй сутнасці пастановы № 991 не прымусіць сябе доўга чакаць.

**ВІКТАР АЛЯШКЕВІЧ**

# ДЫПЛАМАТЫ З ПАДНЯБЕСНАЙ У ЗОНЕ РЫЗЫКОЎНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА

Дэлегацыя супрацоўнікаў Амбасады Кітайскай Народнай Рэспублікі на чале з Чэнь Дайвэнь, Часовым паверaным у справах Кітая ў Рэспубліцы Беларусь, 31 ліпеня наведала аграгарадок пад Слуцкам. Дыпламатаў, якія прыбылі з мэтай пашырэння і паглыблення беларуска-кітайскіх адносін, у глыбінцы, як водзіцца, сустракалі з песнямі і караваем.

Кіраўнік СВК “Аграфірма “Лучнікі” Мікалай Васілевіч, праводзячы для гасцей экскурсію па гаспадарцы, якой кіруе некалькі дзесяткаў гадоў, адзначыў, што Беларусь – зона рызыкоўнага земляробства ў сувязі з кліматычнымі ўмовамі. Аднак ягоная гаспадарка – адна з лепшых на Случчыне – з’яўляецца рэнтабельнай.

Больш за ўсё кітайскіх дыпламатаў здзівіла тое, што за кошт сродкаў гаспадаркі былі пабудаваны аб’екты сацкультбыту і кожны год узводзіцца жыллё для працаўнікоў аграфірмы. Акрамя таго, гасцей прыемна ўразіў музей гісторыі развіцця сельгаспрадпрыемства, бадай, адзіны ў рэспубліцы. Толькі тут вы знойдзеце рэканструяваны кабінет старшыні калгаса сярэдзіны мінулага стагоддзя. Дарэчы, палітычны саветнік кітайскага амбасадара даволі ўтульна пачуваў сябе ў крэсле галоўнага калгасніка (гл. фота).

Кіраўнік слуцкай “вертыкалі” Аляксандр Драко, звяртаючыся да прадстаўнікоў кітайскай амбасады, сказаў, што “нашы народы падобныя… вы працуеце, як мурашы. І мы таксама падчас жніва”. І дадаў: “У нас, на Случчыне, усяго адзін працэнт беспрацоўных. І тое не таму, што працы няма, а таму, што працаваць не хочуць”.



*Чэнь Даньвэню ў гэтым крэсле ўтульна*

Частавалі стомленых ад уражанняў і дарогі гасцей у вясковым рэстаране пельменямі з булёнам, дранікамі і коржыкамі з мукі мясцовай вытворчасці.

**НАТАЛЛЯ ШОП**

# ЯКІХ СПЯВАЧАК ЗАМАЎЛЯЮЦЬ

У інтэрв'ю газеце "Камсамольская праўда" былы генпрадзюсер тэлеканала АНТ Ягор Хрусталёў зрабіў амаль сенсацыйную заяву: больш за палову спявачак уключаюцца ў канцэрты па просьбах зверху. "За спявачак просяць на розных узроўнях: пастаўце ў канцэрт тую, гэтую, – распавёў закулісныя падрабязнасці Хрусталёў. – І вецер увесь час мяняецца: то ставіць нейкую спявачку ў эфір, то не ставіць. Больш за палову выканаўцаў уключаюцца ў канцэрт, так бы мовіць, па просьбе…" "Тут і цяпер" паспрабавала высветліць, якіх спявачак часцей за ўсё замаўлялі зверху.



## ЯК ТРАПІЦЬ У "ПЕСНЮ ГОДА"?

Адзін з самых папулярных праектаў тэлеканала АНТ – "Песня года". У свой час у калямузычных колах хадзілі чуткі, быццам бы ўдзел у гэтым праекце каштуе для артыста прыкладна 300 долараў. Але спевакі, музычныя эксперты і прадзюсеры, з якімі гутарыў карэспандэнт **"Тут і цяпер"**, кажуць, што ўсё гэта лухта.

Тэлевізіёншчыкі, якія мелі дачыненне да "Песні года" і маглі адносна лёгка вырашыць пытанне ўдзелу альбо няўдзелу ў канцэрце, грошай ніколі не бралі.

*"Варта было б некаму аднаму заплаціць, і тут жа гэтая навіна абляцела б усіх,* – выказваюць сваё меркаванне эксперты. – *І без гучных і непрыгожых скандалаў дакладна не абышлося б".*

Таму некаторыя зоркі траплялі ў эфір АНТ дзякуючы свайму таленту і добрым песням, а некаторыя…

## ЦІ ПРАСІЛІ ЗА ДАРАФЕЕВУ?

Паводле слоў тых, хто мае пэўнае дачыненне да тэлевізійнай кухні, ніколі зверху не прасілі за **Іну Афанасьеву, Іскуі Абалян, Ганну Шаркунову**.

Амаль усе музычныя эксперты сышліся ў меркаванні, што сёння гэтыя спявачкі ўваходзяць у так званы "першы эшалон" беларускага шоу-бізнесу.

Дарэчы, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь **Ірына Дарафеева**, якой людская пагалоска даўно прыпісвае сувязь з адным высокапастаўленым чыноўнікам, трапляла далёка не ва ўсе музычныя праекты АНТ.

*"Падобныя канцэрты для Дарафеевай ужо даўно нецікавыя,* – прыходзяць да высновы музычныя аналітыкі. – *Для Ірыны больш важныя іншыя пытанні, напрыклад, якія тычацца гастроляў".*

Вядома, што са сваімі канцэртамі Ірына Дарафеева ўжо ўздоўж і ўпоперак аб'ехала ледзь не ўсю Беларусь. І квіткі на яе канцэрты не самыя танныя: Дарафеева працуе па такіх коштах, якія большасці беларускіх артыстаў толькі сняцца. Да таго ж спявачка

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, твар краіны:**



– Мне не надта хочацца каменціраваць гэтую тэму. Магу шчыра сказаць: я ніколі не перажываю з-за таго, уключаюць мяне ў канцэрт альбо не…

**Вікторыя АЛЕШКА, адна з самых яркіх салістак Маладзёжнага тэатра эстрады:**



– Я сама за сябе заўсёды прашу. Да крызісу ўсё было яшчэ больш-менш нармальна, і, калі я працавала разам з Раінчыкам, у мяне не паўставала пытанняў наконт канцэртаў, у тым ліку і на ўрадавым узроўні. А потым, калі пачала працаваць самастойна, то зразумела: у нашай краіне, калі нехта за цябе не папросіць (я маю на ўвазе не чыноўнікаў, а ў першую чаргу такіх прадзюсераў, як Кубышкін альбо Саваш), то нічога не атрымаецца. Справа ў тым, што ў нас вельмі шмат артыстаў і ўсе хочуць трапіць на той жа "Славянскі базар", іншыя канцэрты… Апошнім часам я званю рэжысёрам і проста нагадваю пра сябе. І мне прапаноўваюць альбо спецыяльна дуэтам, альбо выступіць сольна.

**Генадзь МЕЛЬНІКАЎ, прадзюсер спявачкі ЖАНЕТ:**

– Мы праехалі шмат па якіх гарадах Беларусі, зрабілі больш за 140 канцэртаў без усялякіх лістоў і папер зверху. Народ, як кажуць, не падманеш. І калі людзі любяць артыста, то прыходзяць на ягоныя канцэрты без рэкамендацый зверху. На сённяшні дзень Жанет – адна з тых артыстак, на якіх народ ідзе добраахвотна. Таму мы ніколі не карысталіся нічыёй падтрымкай. І нам ніколі не прапаноўвалі, каб за нас нехта прасіў.

Я лічу, што спявачка Жанет – не самае горшае, што ёсць сёння на беларускай эстрадзе. Нікога не трэба ўпрошваць узяць яе ў нейкі праект, бо яна любы праект толькі ўпрыгожыць сваімі песнямі, шоу-балетам. А тое, што пра яе гавораць... Самае добрае, што такія размовы ёсць. Гэта значыць, што артыст выклікае пэўны інтарэс, ён яшчэ жывы. Але, паўтаруся, мы працуем самі, ні ў кога нічога не просім. І на сённяшні дзень Жанет – адна з нямногіх артыстак, якія заўсёды самастойна збіраюць поўныя залы...

**Вера КАРЭТНІКАВА, фіналістка расійскага конкурсу "Народны артыст-2":**



– Пра мяне ходзіць шмат самых розных чутак. Але, калі шчыра, я нават не ведаю, хто і калі за мяне прасіў. Калі я некаму сімпатычная і нехта недзе закінуў за мяне слоўца, то мне пра гэта не дакладвалі. Дый не хачу я пра гэта ведаць. Бо хочацца, каб на розныя мерапрыемствы мяне запрашалі не з-за таго, што нехта папрасіў, а таму, што ў мяне ёсць добрыя песні і што знешне я прывабная артыстка, якіх у нас не так шмат.

У той жа час на самых розных узроўнях мы заўсёды прапіхваем сваіх…

Сёння ў нас няма магчымасці рабіць канцэрты, у якіх будуць прымаць удзел 70 выканаўцаў, якія ёсць у Беларусі. Таму кожны павінен змагацца за месца пад сонцам, у гэтым сутнасць выжывання на нашай эстрадзе. Краіна маленькая, шоу-бізнес не настолькі моцна развіты, з гэтай прычыны выбіцца і паказацца, атрымаць эфір вельмі складана. І калі ў людзей ёсць нейкія выхады, ёсць магчымасць гэтага дамагчыся, то чаму б і не? Гэта нармальна, на мой погляд. Іншая справа, што адным гэта больш патрэбна, другім – менш. Таму я не супраць, каб нехта за некага прасіў...

# ЧЫНОЎНІКІ

працуе не адна. Разам з ёй ездзяць музыканты, балет. І каб яны таксама атрымалі прыстойныя ганарары, квіткі павінны каштаваць дорага. А цэны на білеты ў раённых цэнтрах за апошнія гады не мяняліся, і ў лепшым выпадку яны дасягаюць 12–15 тысяч. Таму без выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу проста нерэальна зрабіць так, каб канцэрты Дарафеевай акупіліся...

Вядома, што ў апошняй існуе свая студыя па вытворчасці песень, дзе працуюць менеджэры, гукарэжысёры. І ўтрымліваць такую студыю толькі на грошы з канцэртаў даволі складана: на Беларусі ёсць прыклады, калі пяць-дзесяць артыстаў (прычым не самых горшых) не могуць акупіць значна меншыя студыі…

*“У свой час Ірына Дарафеева з прадзюсерам зрабілі выдатны піяр-ход: запрасілі ў сваю студыю кіраўніка дзяржавы і такім чынам заручыліся ягонай падтрымкай,* – лічаць музычныя эксперты. – *Цяпер, калі Ірына час ад часу трапляе на прыём да таго альбо іншага губернатара, той проста не мае маральнага права адмовіць ёй у просьбе дапамагчы арганізаваць канцэрт… І тут ужо не патрэбны ніякія просьбы зверху…”*

## ГАЛІНУ ШЫШКОВУ ВЫКРЭСЛІВАЛІ

Многія кажуць, што сам Ягор Хрусталёў паражываў, калі кіраўніцтва тэлеканала, на якім ён да нядаўняга часу працаваў, выкрэслівала са спіса ўдзельнікаў таго альбо іншага праекта спявачку Галіну Шышкову, з якой у яго здарылася каханне.

*“Шышкова сапраўды была перспектыўнай артысткай, але ў многія праекты яна трапляла дзякуючы Ягору,* – распавялі “Тут і цяпер” тыя, хто добра ведае і Шышкову, і Хрусталёва. – *Аднак нягледзячы на тое, што Хрусталёў адказваў за большасць музычных праектаў, якія рабіў тэлеканал АНТ, ён не быў усёмагутным, бо даволі часта Галіну Шышкову выкрэслівалі са спісаў менавіта з-за сувязі з генпрадзюсерам АНТ…”*

Між іншым, і сама Шышкова ў адным з апошніх інтэрв’ю сказала: *“Раней Ягор не браў мяне ў нейкія праекты, каб яго не чапалі. А цяпер… Тэлеканалаў шмат, запрашаюць на розныя шоу, у праграмы, хаця незразумела, чаму мяне не бяруць у нейкія глабальныя праекты, скажам, урадавыя канцэрты…”*

## ПА ВАШЫХ ПРОСЬБАХ…

Калі верыць нашым суразмоўцам, ціск з боку высокіх чыноўнікаў на прадзюсераў стаў своеасаблівым стартам для некаторых артыстаў. У іх рэпертуары з’явіліся добрыя песні. А дзякучы папулярным тэлевізійным праектам гэтыя артысты сталі больш запатрабаваныя і пазнавальныя. Вядомасць гэта ці папулярнасць – можна спрачацца.

Сярод прозвішчаў тых чыноўнікаў, хто апекаваў артыстак, называюць імя сябра дзяцінства А.Лукашэнкі **Уладзіміра Канаплёва**. Маўляў, менавіта ад гэтага ўплывовага ў свой час чыноўніка зыходзілі просьбы падтрымаць, напрыклад, **Жанет, Веру Карэтнікаву** альбо **Вікторыю Алешку**.

**ПАЛІНА ПЛАТОНАВА** *спецыяльна для svabodaby.net.*

**ТЫМ ЧАСАМ**

## НАВУМАВУ ПАДАБАЕЦЦА “ЦЯНІ-ТАЛКАЙ”



Ёсць чыноўнікі, якія просяць за дзяўчат, а вось былы міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў апекаваў бойз-бэнд. Ну проста падабаецца генералу гэтая група! Дарэчы, хлопцы з “Цяні-Талкай” ахвотна адгукаліся на запрашэнні паўдзельнічаць у розных мерапрыемствах па лініі МУС. І пасля сыходу Навумава з пасады міністра група па-ранейшаму карыстаецца попытам у сілавых структурах.

Шаноўны чытач!
Мы распачынаем новую рубрыку – ПАРАЛЕЛІ – у якой збіраемся параўноўваць розныя аспекты жыцця ў нас, у Беларусі, і ў суседняй Літве. Чаму менавіта Літва? Таму што цягам стагоддзяў мы былі адной дзяржавай, а сёння шляхі нашы разышліся. Аднак засталіся моцныя сувязі: эканамічныя, культурныя, ды і проста сваяцкія. Як жывуць нашыя суседзі? Ці моцна адрозніваецца іх жыццё ад нашага? Мы не збіраемся даказваць, што жыць ТАМ лепей, чым ТУТ (альбо наадварот). У нашых планах паказаць вам толькі лічбы і факты.

# ПАРАЛЕЛІ

# КОЛЬКІ “КАШТУЕ” ПЕРШАКЛАСНІК У БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ

## ● БЕЛАРУСЬ: СІМВАЛІЧНАЯ ДАПАМОГА

Падрыхтоўка дзіцяці да школы – справа, якая патрабуе не толькі часу, але і грошай. Сёлетнія беларускія першаклашкі “абыдуцца” бацькам ні многа ні мала ў паўмільёна рублёў, і гэта яшчэ не мяжа.

Сем’і, якія не могуць дазволіць сабе такую суму, мусяць разлічваць толькі на сябе: купляць канцтавары на базары, што танней, альбо абыходзіцца таварамі беларускай вытворчасці. Атрымаць ад дзяржавы сімвалічную дапамогу да 1 верасня (30 % ад бюджэту пражытачнага мінімуму) могуць толькі шматдзетныя сем’і, і ніхто больш.



## НАБЫЦЬ НЕАБХОДНАЕ – НЕ ПРАБЛЕМА

Знайсці ўсё неабходнае для школы зараз нескладана. Прыязджаеш у “Дзіцячы свет”, ГУМ альбо ЦУМ – і вам прама па спісе, які вісіць у кожнай школе, падбяруць усё, што патрэбна: ад алоўкаў да школьнай формы. Адзенне для першаклашак абавязкова павінна быць дзелавым, аднак адзінага крою ці колеру не існуе – на што хопіць бацькоўскіх грошай. Падручнікі купляць не трэба: іх спіс кожны год мяняецца, таму прасцей заплаціць за карыстанне, чым набываць свае.

– Я лічу, што грошы, якія патрэбны на падрыхтоўку дзіцяці да школы, немалыя, тым больш што гэтага хопіць толькі на адзін год, – кажа педагог Наталля, маці першакласніка. – Зэканоміць таксама складана, бо танныя алоўкі за 2 тысячы маюць звычку развальвацца прама ў тачылцы, зручней заплаціць 5–6 тысяч, каб быць упэўненым у іх якасці. Што тычыцца спартыўнай формы, то я не адважылася купіць свайму сыну танны беларускі варыянт, бо ён вельмі нагадвае савецкае трыко – гэта проста жах! Лепш крыху пераплаціць за знешні выгляд – усё роўна канчатковая сума набягае вялікая.

*Заканчэнне на стар. 7*

# АДХРЫСЦІЛІСЯ АД ПАЛІТЫКІ

**На мінулым тыдні вакол адной з самых актыўных і дзейных грамадскіх арганізацый краіны выбухнуў скандал. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГК) выступіла з заявай аб прыпыненні дзейнасці сваёй мемарыяльнай секцыі. Прычына – палітычная актыўнасць крыла, што парушае статут арганізацыі.**



**Антон Астаповіч (на фота злева) ужо даўно быў незадаволены “сумнеўнай дзейнасцю” кіраўніка мемарыяльнай секцыі Вячаслава Сіўчыка (на фота справа), які, паводле ягоных слоў, набіраў палітычныя балы за кошт таварыства.**



## ЯБЛЫК РАЗЛАДУ

У жніўні 2007 года прэзідыум таварыства адмысловай пастановай зацвердзіў стварэнне мемарыяльнай секцыі. Мэта — больш эфектыўная работа грамадскага аб’яднання па “ўшанаванні памяці і мемарыялізацыі ахвяр таталітарных рэжымаў (сталінізму і нацызму) на тэрыторыі Беларусі”.

*“Перыяд 2007–2008 гадоў быў адзначаны актыўнай аднадушнай працай секцыі. Яе намаганнямі былі праведзены грамадска значныя мерапрыемствы, шэраг круглых сталоў, прэс-канферэнцый, навукова-практычная канферэнцыя, выдаваліся інфармацыйныя бюлетэні,* — тлумачыць у заяве **старшыня прэзідыума Антон Астаповіч**. — *На жаль, у 2009 годзе шматлікія актывісты мемарыяльнай секцыі сталі аддаваць прыярытэт актыўнай палітычнай дзейнасці. У той час, калі БДТАПГК не з’яўляецца палітычнай арганізацыяй і мае акрэсленыя статутам таварыства мэты і задачы, секцыя стала палітызавацца, накіроўваць сваю дзейнасць у не прадугледжанае статутам рэчышча, шматлікія крокі сяброў секцыі нават не ўзгадняліся з кіраўнічымі органамі ГА “БДТАПГК”.*

## АПОШНЯЯ КРОПЛЯ

Паводле слоў Антона Астаповіча, пазастатутная дзейнасць секцыі прывяла да пісьмовага папярэджання з боку Міністэрства культуры ў красавіку 2009-га, у звязку з чым прэзідыум таварыства заклікаў секцыю да выканання ў сваёй дзейнасці статута. Аднак папраўкі не былі ўнесены. Апошняй кропляй цярпення кіраўніцтва Таварыства аховы помнікаў стала анансаванае ў СМІ ўваходжанне сяброў мемарыяльнай секцыі ў “антыкамуністычны фронт”, які ствараецца пад эгідай незарэгістраванай палітычнай партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”.

*“Гэта з’яўляецца не толькі грубым парушэннем статута ГА “БДТАПГК”, але і крокам па-за межамі элементарнай этыкі, бо ён быў зроблены за спінай кіраўніцтва аб’яднання, якое пра падзею, што адбылася, даведалася з навіновых інфармацыйных блокаў,* — адзначае Антон Астаповіч. — *У дадзеных умовах дзейнасць секцыі як адной з арганізацыйных структур таварыства не проста немэтазгодная, але ставіць пад удар усю арганізацыю, дыскрэдытуе яе дзейнасць як лідзіруючага грамадскага аб’яднання па ахове і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі”.*

Вынікам стала распараджэнне аб прыпыненні дзейнасці мемарыяльнай секцыі да разгляду пытання на чарговым прэзідыуме арганізацыі ў верасні 2009-га. Гэта значыць, што да восені сябры секцыі мусяць вызначыцца: альбо застацца ў складзе таварыства і адмовіцца ад палітычных амбіцыяў, альбо пакінуць яго і заснаваць самастойнае аб’яднанне.

## “ПРОСТА МЫ ПЕРАРАСЛІ ТАВАРЫСТВА”

Як стала вядома карэспандэнту **“Тут і цяпер”** ад крыніцы ў кіраўніцтве арганізацыі, Антон Астаповіч ужо даўно быў незадаволены “сумнеўнай дзейнасцю” **кіраўніка мемарыяльнай секцыі Вячаслава Сіўчыка**, які, паводле ягоных слоў, набіраў палітычныя балы за кошт таварыства. Сам **Сіўчык** пакуль адмаўляецца ад каментароў, называючы рашэнне Астаповіча “ўнутранай перапіскай арганізацыі”.

А вось **намеснік старшыні мемарыяльнай секцыі Таварыства аховы помнікаў Уладзімір Раманоўскі** распавёў **“Тут і цяпер”,** што не бачыць у тым, што адбылося, нічога надзвычайнага.

*“Ніякай палітыкі тут няма, хаця, па сутнасці, любая грамадская справа ў Беларусі мае да яе дачыненне,* — гаворыць Раманоўскі. — *Рэч у тым, што наша мемарыяльная секцыя, створаная для ўшанавання памяці ахвяр сталінізму ў 2007 годзе, паводле задач і кола інтарэсаў ужо перарасла само таварыства. Тое, чым мы займаліся ўсе гэтыя гады — не толькі штомесячнае ўскладанне кветак да магіл ахвяр рэпрэсій, але і вялікая даследчыцкая дзейнасць, удзел у разнастайных мерапрыемствах,* — *значна шырэй за функцыі і задачы Таварыства аховы помнікаў. Нам цесна ў межах дзеяння статута таварыства, які пісаўся ў савецкі час, а потым быў толькі падкарэктаваны”.*

Намеснік старшыні мемарыяльнай секцыі пераконвае, што асабістыя стасункі тут не замешаны, адзначаючы, што яны не збіраюцца разрываць з таварыствам і захаваюць у яго межах частку былых функцый. *“Аднак відавочна, што Беларусі патрэбен свой “Мемарыял”. Падобныя арганізацыі, якія займаюцца праблемамі нацыянальнай памяці, ёсць амаль ва ўсіх былых рэспубліках СССР,* — заўважае Уладзімір Раманоўскі. — *Таму ўжо даўно наспела патрэба стварэння адпаведнай самастойнай структуры і ў нас. Мы будзем абмяркоўваць гэтае пытанне, улічваючы, натуральна, і тую акалічнасць, наколькі складана ў Беларусі зарэгістраваць новую арганізацыю”.*

**ЯЗЭП ШЧАБЛОЎСКІ**

### ДАВЕДКА

ГА “БДТАПГК” створана 19 чэрвеня 1965 года пастановай ЦК КПБ і Саўміна БССР. Першапачатковай мэтай таварыства стала «прыцягненне шырокай грамадскасці да актыўнага ўдзелу ў ахове помнікаў гісторыі і культуры, павышэнне іх ролі ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей». На пачатку 1970-х колькасць сяброў арганізацыі дасягнула 1 мільёна.

З абвяшчэннем незалежнасці Беларусі арганізацыя цалкам стала на дэмакратычныя рэйкі. Галоўная заслуга таварыства і яе лідэра Антона Астаповіча ў апошнія гады — сістэматычная і паслядоўная “дакументальная” барацьба з дзяржструктурамі за выкананне заканадаўства і захаванне архітэктурных помнікаў.

*Заканчэнне.*
*Пачатак на стар. 5*

У звычайных сярэдніх школах, акрамя здачы грошай на харчаванне і набыцця канцтавараў, ад бацькоў першакласнікаў, якія ідуць у школу згодна з месцам рэгістрацыі, нічога больш не патрабуюць. Аднак у іншых навучальных установах бацькоў могуць чакаць розныя "сюрпрызы".

### НЕПРЫЕМНЫЯ СЮРПРЫЗЫ

– Яшчэ напярэдадні навучальнага года гімназія, у якую я аддавала дачку, намагалася сабраць з бацькоў грошы за амартызацыю парт, – абураецца Кацярына, рэкламны менеджэр. – Такое "раскручванне" на грошы я бачыла ўпершыню. Я не заплаціла, і стаўленне да дзіцяці было адпаведнае. Выцерпеўшы колькі год, мы перайшлі ў звычайную школу – менш клопату.

– Мы паступалі ў школу не па месцы рэгістрацыі (тады яшчэ прапіскі), і, каб дзяцей прынялі ў школу, бацькам прыйшлося скідвацца на новыя свяцільні, – дзеліцца вопытам бацька са стажам Сяргей. – Ужо ў першы год быў створаны бацькоўскі камітэт, які збірае грошы на патрэбы дзяцей. Толькі нярэдка гэтыя сродкі трацяцца на рамонт, а не на паходы ў тэатр. І гэта недапрацоўка нашай сістэмы адукацыі, а не настаўнікаў, якія таксама атрымаюць па карку, калі не збяруць патрэбную суму.

Што ж, як кажуць, вучэнне – святло, і тыя, хто да яго цягнецца, вымушаны мірыцца з усімі патрабаваннямі.

**БЕЛАРУСКІ ПЕРШАКЛАСНІК**

| | |
|---|---|
| **Карыстанне падручнікамі** | Прыкладна **15 тысяч** у год |
| **Школьная форма** | **Касцюм** – 105–140 тысяч; **чаравікі** – 80–100 тысяч; **кашуля** – 10–15 тысяч; **спартыўны касцюм** – 45 тысяч (беларускае трыко), што лепш выглядае – ад 55 тысяч і вышэй; кеды – каля 70 тысяч |
| **Ранец** (расейскі або нямецкі) для 1-4 класаў | **50–60 тысяч** |
| **Набор канцтавараў** (спіс можа вар'іравацца ў залежнасці ад школы) | Каля **100–150 тысяч** |
| **Харчаванне** | Каля **2,5 тысячы** ў дзень абед, экспрэс-сняданак бясплатна |
| **Група прадоўжанага дня** | Аплачваецца толькі харчаванне – каля **50 тысяч у месяц** |

## ● ЛІТВА: КРЫЗІСНЫ ВАРЫЯНТ

Віленчукі, калі іх дзеці дасягаюць 6 альбо 7 гадоў, мусяць вырашаць, у якую школу аддаваць дзіця, бо дакументы можна падаць у любую віленскую школу ці гімназію. Праўда, гэта яшчэ не значыць, што дзіця туды возьмуць. У гутарках пра школу (асабліва ў мультынацыянальных кампаніях) абавязкова ўдакладняецца, з якой мовай навучання будзе школа. Акрамя, зразумела, літоўскіх, у Вільні ёсць польскія, рускія, беларуская і яўрэйская школы.

### У ШКОЛУ ПРАЗ ПСІХОЛАГА

Нарэшце, выбар зроблены. Цяпер трэба ў школу трапіць. Дзіцячы псіхолаг пільна сочыць за тым, каб бацькі (з-за сваіх амбіцый ці яшчэ па якіх прычынах) не скралі ў малечы год дзяцінства. Гутарка з псіхолагам праходзіць пры зачыненых дзвярах і доўжыцца каля гадзіны. Здаўшы іспыт, малыя атрымліваюць афіцыйную паперу з пячаткай і за подпісам дырэктара, у якой псіхолаг пацвярджае гатоўнасць дзіцяці да навучання ў школе.

Далей надыходзіць самы ўлюбёны для ўсіх школьнікаў этап – падрыхтоўка матэрыяльнай базы. Бацькі першакласнікаў атрымліваюць спіс канцтавараў і іншых неабходных рэчаў, якія мусяць набыць дзіцяці. У спісе каля 30 найменняў. Цікавай асаблівасцю з'яўляецца тое, што кожны першакласнік павінен мець пёравую ручку. Дзеці ў пачатковай школе пішуць менавіта такімі.



*Першакласнікі і ў Літве і ў Беларусі радуюцца жыццю аднолькава*

**ЛІТОЎСКІ ПЕРШАКЛАСНІК**

| | |
|---|---|
| **Рабочыя сшыткі і падручнікі** | **117 000 - 140 000 руб** |
| **Школьная форма** | **да 292 500 - 351 000 руб** – пры неабходнасці пашыву ў атэлье *(калі школа падпісала дамову і ўся форма шыецца па адных лякалах)* |
| **Ранец** | Артапедычны **- 127 500 - 631 700 руб** Звычайны - **ад 35 000 руб** |
| **Набор канцтавараў** *(спіс можа вар'іравацца ў залежнасці ад школы)* | **ад 35 000 руб** і вышэй – у залежнасці ад фінансавых магчымасцяў блок офіснай паперы для друку (не ва ўсіх спісах) - **ад 17 500 руб** ручка пёравая (абавязкова) - **9 300 - 41 000 руб.** |
| **Харчаванне** | **11 700 - 17 500 руб. у дзень** |
| **Група прадоўжанага дня** | каля **152 000 руб. за месяц** |

### І ПРЫГОЖА, І НЯДОРАГА НЕ АТРЫМЛІВАЕЦЦА

Маці адной з сёлетніх першакласніц падзялілася з намі сваім поглядам на фінансавы бок справы: *"Мы яшчэ не ўсё падрыхтавалі, але грошай патрацілі ўжо дастаткова. Вось ручку купілі за 30 LT** з гумавым наканечнікам, каб пальчыкі не стамляліся, на астатнія дробязі канцылярскія расходавалі каля 100 LT. З формай пакуль не вырашылі, бо хацелася б і прыгожую, і недарагую, але спалучыць гэта не ўдаецца. Атрымліваецца – альбо шыць у атэлье, альбо беларускую* (на базары школьны камплект беларускай вытворчасці каштуе **30 LT.** – Аўт.). *Увогуле ж я планую патраціць 500–600 LT на тое, каб апрануць дачку, плюс ранец з усім неабходным".*

Што ж рабіць тым бацькам, якія фінансава не ў стане сабраць дзіця ў школу? Па літоўскіх законах, калі на аднаго члена сям'і прыходзіцца менш за 525 LT, усе школьнікі, а таксама садаўскія дзеці з падрыхтоўчай групы атрымліваюць разавую дапамогу ў памеры 156 LT на канцтавары і бясплатнае харчаванне. Праўда, гэта на паперы, а што будзе на пачатку навучальнага года – яшчэ паглядзім. Крызіс на двары.

**ПАДРЫХТАВАЛІ ІРЫНА СІНІЦА І ЛАРЫСА ШАПАВАЛАВА**

**1 LT = 1150 руб.*

# ЦІ НАВЕДАЕ ПАТРЫЯРХ КІРЫЛ КУРАПАТЫ?

## Адказ залежыць ад самога беларускага грамадства

Напачатку дзве цытаты...

*"Я лічу, што Сталін быў пачварай, духоўным вырадкам, які стварыў жудасную, антычалавечую сістэму кіравання краінай, пабудаваную на хлусні, гвалце і тэроры. Ён развязаў генацыд супраць уласнага народа і нясе асабістую адказнасць за смерць невінаватых людзей. У гэтым плане Сталіна можна супаставіць з Гітлерам. Абодва яны прынеслі ў гэты свет столькі гора, што ніякімі ваеннымі або палітычнымі поспехамі нельга загладзіць іх віну перад чалавецтвам. Няма ніякай істотнай розніцы паміж Бутаўскім палігонам і Бухенвальдам, паміж ГУЛАГам і гітлераўскай сістэмай лагераў смерці"*, – гэтыя словы належаць архіепіскапу Валакаламскаму Іларыёну, кіраўніку аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага патрыярхату. Прамовіў ён іх, адказваючы на пытанні журналістаў, у сярэдзіне чэрвеня.

А вось што сказаў Патрыярх Маскоўскі Кірыл падчас свайго візіту ва Украіну ў адказ на просьбу пракаменціраваць рашэнне Парламенцкай асамблеі АБСЕ абвясціць 23 жніўня Днём памяці ахвяр сталінізму і нацызму: "*Нельга параўноўваць нацызм і сталінізм*". Гэта святар заявіў, выступаючы ў эфіры аднаго з украінскіх каналаў напрыканцы ліпеня.

Трэба адзначыць, што сёлетні візіт Патрыярха Маскоўскага Кірыла ва Украіну прыцягнуў надзвычай вялікую ўвагу. Як вядома, восенню чакаецца яго візіт у Беларусь. Безумоўна, дзеяннямі і словамі нядаўна інтранізаванага Патрыярха Рускай праваслаўнай царквы цікавяцца не толькі праваслаўныя вернікі, але і людзі самых розных канфесій і поглядаў.



Пакінем убаку рознагалоссі, якія існуюць паміж РПЦ і Ватыканам, а таксама грэка-уніяцкай царквой, Украінскай праваслаўнай царквой, частка якой адпала ад Маскоўскай патрыярхіі, Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквой і г.д. Гэта ўсё у рэшце рэшт справа саміх вернікаў і іх сумлення, да якой царквы належаць. Але ж Вярхоўны прадстаяцель Рускай праваслаўнай царквы з'яўляецца па азначэнні найвышэйшым маральным аўтарытэтам для мільёнаў хрысціян, у тым ліку і па-за межамі Расіі.

Слова святара згодна з царкоўнымі прынцыпамі ёсць Справа. Да слоў Кірыла чуйна прыслухоўваюцца не толькі ў Расіі. Хоць у Расіі, канечне, найперш. Частка расійскага грамадства звязвае з імем Кірыла спадзяванні на маральнае адраджэнне і пакаянне. Пасля слоў Патрыярха пра нацызм і сталінізм многія ў гэтым усумніліся. Хоць некаторыя расійскія лібералы яшчэ нядаўна параўноўвалі цяперашняга Патрыярха з Папам Рымскім Іаанам Паўлам II. Як вядома, з візіту Папы ў Польшчу ў 1979-м годзе і яго слоў "Не бойцеся!" пачыналася польская "Салідарнасць", а ўслед за ёй – вызваленне ўсёй Усходняй Еўропы ад камунізму. Але ж іншыя на гэта пярэчылі: не ў РПЦ, якая шмат стагоддзяў была звязана з самаўладдзем і якую, у сваім цяперашнім выглядзе, ствараў фактычна Сталін, трэба шукаць свабоду. Гэта можна было б лічыць праблемай самой расійскай інтэлігенцыі, з якіх крыніц чэрпаць духоўную свабоду, на каго і на што абапірацца ў барацьбе за дэмакратыю. Аднак РПЦ, як паказаў візіт Патрыярха, прэтэндуе на духоўнае пастырства не толькі над Расіяй, але і над Украінай, і Беларуссю, пры гэтым адмаўляючы іх народам у праве на ўласную гісторыю, мову, веру і незалежнасць.

Трэба аддаць належнае Патрыярху Кірылу – у Кіеве ён усё ж асудзіў сталінскія злачынствы, якія назваў "рэпрэсіямі". І ўсклаў вянок да помніка ахвярам Галадамору ва Украіне. Пры гэтым ён не стаў удакладняць, ці былі загінуўшыя ад масавага голаду ў 1930-я гады ахвярамі генацыду і хто яго справакаваў. Гэта не так ужо і важна.

Але ці ўшануе Патрыярх Маскоўскі падчас свайго будучага візіту ў Мінск памяць ахвяр сталінізму ў Курапатах альбо ў якім-небудзь іншым месцы? На жаль, спадзявацца на гэта не даводзіцца. Да прызнання Сталіна злачынцам і пачварай не гатовы пакуль ні КДБ, ні вышэйшае кіраўніцтва краіны, ні грамадства ў цэлым. А без пакаяння не можа быць і даравання, хто б з першасвятароў да нас у Беларусь ні прыехаў.

**МАКСІМ ПЕШКА**

**P.S.**

Сёлета ў Глыбокім, у сутарэннях праваслаўнай бажніцы Раства Святой Маці Божай, знайшлі астанкі некалькіх чалавек. Знойдзеныя рэчы – фрагменты вопраткі, пачак з-пад цыгарэт з надпісам па-польску, цудам ацалелы пашпарт – сведчаць, што гэтыя людзі былі, хутчэй за ўсё, грамадзянамі даваеннай Польшчы. А знойдзеная куля ад нагана дазваляе меркаваць, што яны маглі стаць ахвярамі НКУС у 1940-м годзе. Пракуратура, аднак, гэта адмаўляе, як і той факт, што людзі былі забіты. Пра жудасную знаходку грамадству стала вядома дзякуючы валанцёрам з Аб'яднання моладзі Беларускай праваслаўнай царквы, якія ўпарадкавалі глыбоцкую царкву. Магчыма, у гэтых маладых людзях і трэба шукаць надзею на змены да лепшага?

**КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ НАШУ ГАЗЕТУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ,**
ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET.

**КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ ГАЗЕТЫ,**
ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL info@svabodaby.net ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 21:45 5.08.09
Тыраж 299 экзэмпляраў